**11 (160)**
**лістапад**

Выдаецца
са студзеня 1993 г.

*Пасведчанне
аб рэгістрацыі
№ 1221 ад
8 лютага 2010 г.*

Выходзіць 12 разоў
у год (з ліпеня 2003 г.)

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

## НАВУКОВЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСОПІС

**Заснавальнікі:**

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне», дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

*Галоўны рэдактар Максім Навумавіч Гальпяровіч*

***Рэдакцыйная калегія:***
**Канстанцін Бандарэнка, Сымон Барыс, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Валерый Жук, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Клюня, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Надзея Кушнер, Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Аляксандр Смолік, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часнoўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.**

***Рэдакцыйная рада:***
**Уладзімір Адамушка, Юрый Бохан** (старшыня рады), **Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішэвіч, Ала Галубовіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Аляксандр Каханоўскі, Марына Краснова, Іван Крэнь, Аляксандр Кушнярэвіч, Вячаслаў Лазіцкі, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Сяргей Новікаў, Алег Слука, Валерый Талкачоў, Людміла Трыгорлава, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Неаніла Цыганок, Анатоль Шаркоў.**

***Рэдакцыя:***
Намеснік галоўнага рэдактара — **Наталля Матусевіч**, рэдактар аддзела — **Надзея Кушнер**, мастацкае афармленне — **Уладзімір Малахаў**, вёрстка — **Надзея Пяткоўская**, карэктура — **Галіна Шалюта.**

ЗМЕСТ

| | | |
|---|---|---|
| | Слова ад рэдакцыі | 3 |
| | **ЗНАХОДКІ І АДКРЫЦЦІ** | |
| Алег Яноўскі, Арцём Яноўскі | Малавядомы артыкул У.І.Пічэты "Барадзіно" ў праламленні праз лёс і творчасць гісторыка | 5 |
| | **ГІСТАРЫЯГРАФІЯ** | |
| Сяргей Новікаў | Лепельская аперацыя летам 1941 года: спроба навуковай інтэрпрэтацыі | 14 |
| | **ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ** | |
| Вольга Вярбіцкая, Аляксандр Смолік | Гістарычны дыскурс у творчай спадчыне Якуба Коласа | 25 |
| | **АРХЕАЛОГІЯ** | |
| Махамед Рокан | Раскопкі царскіх пахаванняў у горадзе Ур | 33 |



Аляксандр КОРЗЮК

# Формы арганізацыі актыўнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў у працэсе навучання гісторыі

*У методыцы выкладання гісторыі сфарміраваліся ўстойлівыя формы правядзення вучэбных заняткаў, якія вызначаюцца пераважаннем пэўнага метаду навучання гісторыі. У школьнай практыцы найбольшае распаўсюджванне атрымалі ўрокі-экскурсіі, школьныя лекцыі, дыскусіі, дыспуты, гульні, дэбаты, канферэнцыі, семінары. У дадзеным артыкуле мы разгледзім тыя формы ўрока, што вызначаюцца выкарыстаннем наглядная (экскурсія) і славеснага (лекцыя, дыскусія, дыспут) метадаў навучання. У снежаньскім нумары будуць прадстаўлены метадычныя рэкамендацыі па правядзенні тых форм урока, на якіх прымяняюцца практычныя метады навучання гісторыі.*

У папярэдніх артыкулах рубрыкі мы пераважна разглядалі практычную рэалізацыю метадаў навучання гісторыі. Увагу чытачоў мы звярталі на тое, што пры арганізацыі працэсу навучання гісторыі настаўніку неабходна імкнуцца выкарыстоўваць разнастайныя формы, метады і прыёмы навучання. Яны актывізуюць мысленне школьнікаў, забяспечваюць пастаянны ўдзел вучняў у адукацыйным працэсе, вучаць уменню самастойна прымаць рашэнні, павышаюць ступень матывацыі і эмацыянальны стан, забяспечваюць рэфлексійную дзейнасць настаўніка і вучняў.

Актыўнай пазнавальнай дзейнасці вучняў у ходзе вывучэння гісторыі спрыяе выкарыстанне настаўнікам разнастайных форм правядзення ўрока. Нагадаем, што калі *тып* урока вызначаецца яго асноўнай дыдактычнай мэтай, то *форма* — асноўным метадам арганізацыі ўзаемнай дзейнасці настаўніка і вучняў і пераважным на дадзеным уроку метадам падачы матэрыялу. На наш погляд, рэалізацыі адукацыйнага патэнцыялу вучэбнага гістарычнага матэрыялу будзе садзейнічаць правядзенне ўрокаў у такіх формах, якія прадугледжваюць арганізацыю актыўнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці школьнікаў і адпавядаюць іх узроставым асаблівасцям. Паспяховасць іх правядзення залежыць ад шэрага ўзаемазвязаных дзеянняў настаўніка і вучняў[1]:

— падрыхтоўцы да такіх урокаў надаецца асаблівая ўвага: раздаюцца папярэднія заданні, тлумачыцца структура ўрока, роля і задачы вучняў, рыхтуюцца наглядныя і тэхнічныя сродкі навучання;

— прадумваецца план занятку з улікам узроўню падрыхтоўкі і асаблівасцей усяго класа і асоб-



***КОРЗЮК Аляксандр Аляксандравіч.***
*Загадчык кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі БДПУ імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1977 г. у Мінску. У 1999 г. закончыў гістарычны факультэт БДПУ імя Максіма Танка. Лаўрэат прэміі Мінгарвыканкама (2001 г.) і прэміі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных вучняў і студэнтаў "За асабісты ўклад у развіццё здольнасцей таленавітай моладзі" (2005 г.). Аўтар каля 100 навуковых і метадычных публікацый, у тым ліку дапаможнікаў "Шляхі фарміравання пазнавальнага інтарэсу вучняў у працэсе вывучэння гісторыі Беларусі ў школе (канец XVIII — пачатак XX ст.): метад. дапам." (Мн., 2005), "Вывучэнне гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст. у агульнаадукацыйнай школе" (Мн., 2010, 2011), "Выкарыстанне дакументальнага матэрыялу на ўроках гісторыі і грамадазнаўства" (у сааўт. Мн., 2012); вучэбна-метадычнага комплексу факультатыўных заняткаў "Беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі: фарміраванне індустрыяльнага грамадства і нацыі (канец XVIII — пачатак XX ст.)" (у сааўт. Мн., 2010).*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ных вучняў, характару і здольнасцей школьнікаў, якія атрымалі заданне да гэтага ўрока і г.д.;

— прадумваюцца спосабы актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці ўсіх вучняў, у тым ліку абыякавых да вывучэння прадмета, слабых, «цяжкіх» для таго, каб усе былі зацікаўлены і ўключаны ў той ці іншай ступені ў актыўную работу.

У дадзеным артыкуле мы ахарактарызуем некаторыя з такіх форм урока і пералічым метадычныя патрабаванні да іх правядзення. Адзначым, што вельмі часта і ў метадычнай літаратуры, і ў педагагічнай практыцы падобныя формы ўрока падаюцца як *«нетрадыцыйныя»*. Паспрабуем разабрацца, ці так гэта на самай справе.

Нетрадыцыйныя формы ўрокаў у савецкай дыдактыцы і методыцы пачалі апісваць у апошняй чвэрці XX ст. Аднак да гэтага часу дадзенае паняцце не мае дакладнага азначэння, застаецца расплывістым. Варта адзначыць і мноства яго сінонімаў, сярод якіх — «нестандартны ўрок», «нетрадыцыйныя віды ўрока» і г.д. Дастаткова распаўсюджана азначэнне нетрадыцыйнага ўрока як імправізаванага вучэбнага занятку, які мае нетрадыцыйную (неўстаноўленую) структуру. Многія педагогі разглядаюць нетрадыцыйны ўрок як незвычайны па сваёй задумцы, арганізацыі і методыцы правядзення. У сучаснай тэорыі і практыцы навучання вылучаюцца два асноўныя падыходы да разумення дадзеных форм урока[2]. Першы з іх вызначаецца як адыход ад дакладнай структуры традыцыйнага камбінаванага ўрока і спалучэнне разнастайных метадычных прыёмаў. Другі падыход характарызуецца выкарыстаннем разнастайных форм урока, якія шырока распаўсюджаны ў сучаснай школе. У дадзеным артыкуле мы будзем абапірацца менавіта на другі падыход.

Правядзенне экскурсій, вучэбных гістарычных гульняў, дыскусій, урокаў-канферэнцый, семінараў, дыспутаў і г.д. дазваляе пазбягаць прагалаў рэпрадуктыўнага навучання, рэалізаваць асобасны падыход у адукацыйным працэсе, актыўна выкарыстоўваць выхаваўчы патэнцыял прадмета. Аднак дадзеныя формы ўрокаў не з'яўляюцца чымсьці *сапраўды «нетрадыцыйным»* — большасць з іх добра вядома ў дыдактыцы і падрабязна апісана ў прадметных методыках. Іншая справа, што такія формы ўрока ў сярэдняй школе ўжываюцца адносна рэдка, таму з'яўляюцца «нетрадыцыйнымі» ў сілу таго, што поўнавартаснае правядзенне такога ўрока патрабуе грунтоўнай папярэдняй падрыхтоўкі як настаўніка, так і вучняў.

Прааналізуем методыку правядзення названых вышэй форм урока. **Экскурсія** — форма арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы, калі вучні трапляюць на месца знаходжання вывучаемых аб'ектаў для непасрэднага азнаямлення[3]. Істотнай перавагай урокаў-экскурсій з'яўляецца «эфект прысутнасці» вучняў — яны маюць магчымасць убачыць помнікі гісторыі і культуры або музейную экспазіцыю. Галоўная *асаблівасць урока-экскурсіі — пабудова яго зместу* на аснове матэрыялу пра помнікі гісторыі і культуры. Высокай ступені пазнавальнасці ўрока-экскурсіі спрыяе тое, што падчас яго правядзення закранаюцца пачуцці і эмоцыі вучняў. Таму ўрокі-экскурсіі з'яўляюцца дзейсным сродкам канкрэтызацыі і паглыблення гістарычных ведаў, ідэйна-маральнага і грамадзянска-патрыятычнага выхавання вучняў.

Паколькі высокі метадычны ўзровень правядзення ўрока-экскурсіі вызначаецца ступенню прафесіяналізму настаўніка-экскурсавода, то ў метадычнай літаратуры вылучаюцца наступныя патрабаванні да яго ***прафесійнай падрыхтоўкі***[4]:

- сістэматычнае папаўненне сваіх ведаў;
- удасканаленне экскурсійнага майстэрства;
- творчы падыход да сваёй справы;
- пошук аптымальных спосабаў дасягнення навучальных, развіваючых і выхаваўчых задач урока-экскурсіі.

Тым не менш, як паказвае практыка, найбольш часта сустракаюцца наступныя *недахопы ўрокаў-экскурсій*:

- лекцыйнасць — адрыў ад паказу аб'ектаў і захапленне аповядам;
- фрагментарнасць раскрыцця асобных аб'ектаў без выяўлення іх узаемасувязей;
- адсутнасць лагічнай і храналагічнай паслядоўнасці вывучаемых падзей.

Каб пазбегнуць гэтых недахопаў, настаўніку неабходна валодаць методыкай падрыхтоўкі і правядзення ўрока-экскурсіі.

Каб правільна вызначыць месца і ролю ўрока-экскурсіі ў сістэме ўрокаў па тэме прадмета, неабходна пазнаёміцца з іх **класіфікацыяй**. Так, па ступені *адпаведнасці тэматыкі экскурсіі вучэбнай праграме* вылучаюць экскурсіі вучэбныя (праграмныя) і пазавучэбныя (пазапраграмныя); па ступені *выкарыстання музейнай экспазіцыі* — агляданыя, тэматычныя і комплексныя. На нашу думку, напрыклад, на ўроках гісторыі Беларусі мэтазгодна выкарыстоўваць вучэбныя тэматычныя экскурсіі. Па *месцы* і *ролі экскурсіі ў вучэбным працэсе* бываюць уступныя, заключныя, экскурсіі па вывучэнні новага матэрыялу і паўторна-абагульняючыя экскурсіі[5].

У падрыхтоўцы ўрока-экскурсіі звычайна вылучаецца ***пяць асноўных этапаў***[6]. Коратка прадставім іх змест і работу настаўніка на кожным з іх.

1. *Выбар тэмы і вызначэнне мэты ўрока-экскурсіі.* Кожная тэма складаецца з асобных пытанняў — падтэм, якія неабходна раскрыць падчас урока-экскурсіі, таму паміж падтэмамі неабходна захоўваць сувязі. Мэта ўрока-экскурсіі вызначаецца навучальнымі, развіваючымі і выхаваўчымі задачамі, якія павінны быць дасягнуты ў выніку засваення вучнямі вучэбнага гістарычнага матэрыялу. Метадычна абгрунтаваны выбар тэмы і мэты ўрока-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

экскурсіі з'яўляецца асабліва важным, бо яны вызначаюць кола крыніц, адбор аб'ектаў і метады правядзення экскурсіі.

2. *Адбор і вывучэнне літаратуры, крыніц і аб'ектаў.* На гэтым этапе неабходна скласці спіс літаратуры і крыніц па тэме, пры неабходнасці атрымаць кансультацыю музейнага работніка або экскурсавода. Далей трэба адабраць і вывучыць неабходныя аб'екты для дэманстрацыі, улічваючы, што музейныя экспазіцыі, як правіла, створаны па храналагічна-тэматычным прынцыпе. У літаратуры сустракаюцца розныя прыклады афармлення картак для падрыхтоўкі экскурсіі ў музеі[7]. З улікам сучасных патрабаванняў да ўрока прапануем наступную форму дадзенай карткі. *(гл. табліцу 1 ).*

*Табліца 1*

**Узор карткі для ўрока-экскурсіі ў музеі**

Прадмет ____________________

Тэма ________________________

| № п/п | № стэнда | Назва экспаната або матэрыялу для выкарыстання | Метадычныя прыёмы выкарыстання |
|---|---|---|---|

3. *Работа над структурай і тэкстам экскурсіі.* Вывучаемы на ўроку-экскурсіі матэрыял павінен мець свой пачатак, развіццё і завяршэнне, прычым агледжаны ў пачатку матэрыял павінен падрыхтаваць успрыманне наступнай вучэбнай інфармацыі. Таму ўрок-экскурсія складаецца з *трох асноўных частак:* уступнай, асноўнай часткі і заключэння. Мэта *ўступнай часткі* — прыцягнуць увагу вучняў і падрыхтаваць іх да ўспрымання вучэбнага матэрыялу. Па працягласці яна павінна займаць 5—7 хвілін і быць мэтанакіраванай, актуальнай, цікавай. Ва ўступнай частцы неабходна назваць тэму і мэту экскурсіі, асноўныя пытанні і асноўныя аб'екты, якія будуць разгледжаны ў яе ходзе. У *асноўнай частцы* павінен раскрывацца галоўны змест урока-экскурсіі. Пры яго распрацоўцы неабходна надаваць увагу ўнутраным сувязям паміж падтэмамі і лагічным пераходам ад адной падтэмы да другой. У *заключэнні* робяцца абагульненні, фармулююцца высновы і падводзяцца вынікі ўрока-экскурсіі. Неабходна ўлічваць, што калі час урока-экскурсіі будзе перавышаць час звычайнага ўрока, то яго максімальная працягласць не павінна быць больш за адну гадзіну для малодшых школьнікаў і 1 гадзіну 20 хвілін для старшакласнікаў[8].

4. *Работа над методыкай правядзення ўрока-экскурсіі.* Ад якасці ажыццяўлення дадзенага этапу залежыць узровень пазнавальнай дзейнасці вучняў, аб'ём засвоенага гістарычнага матэрыялу і глыбіня яго асэнсавання. Вылучаюцца наступныя асноўныя метады, якія прымяняюцца ў ходзе ўрока-экскурсіі, — дэманстрацыя, аповяд, гутарка. Як правіла, яны асобна не прымяняюцца. Кожны з названых метадаў разлічаны на актыўнае ўспрыманне вучнямі вучэбнага матэрыялу. У залежнасці ад тэмы, мэты, характару аб'ектаў урока-экскурсіі, узросту і ўзроўню ведаў вучняў роля і суадносіны экскурсійных метадаў могуць мяняцца. Гаворачы аб суадносінах дэманстрацыі і аповяду, адзначым, што на ўроку-экскурсіі вядучай крыніцай ведаў з'яўляецца не толькі слова настаўніка, але і экскурсійны аб'ект. Таму настаўнік павінен імкнуцца звязаць візуальныя ўражанні вучняў са зместам вывучаемага матэрыялу. Пры правядзенні ўрока-экскурсіі ў школьным музеі можна далучаць юных экскурсаводаў.

Пры падрыхтоўцы ўрока-экскурсіі неабходна прадумваць *пазнавальныя заданні* для вучняў — як апераджальныя, так і для дамашняй работы па яго выніках. Іх выкананне спрыяе лепшаму засваенню вывучанага матэрыялу, усведамленню гістарычных заканамернасцей, асэнсаванню высноў і абагульненняў, развіццю творчага мыслення. Распрацоўваючы такія заданні, варта ўлічваць іх адпаведнасць тэме, ступень даступнасці для вучняў у залежнасці ад узроўню іх падрыхтоўкі. Асноўным патрабаваннем да пазнавальных заданняў з'яўляецца іх скіраванасць на актывізацыю пазнавальнай дзейнасці, развіццё творчых здольнасцей, выбар і жаданне саміх школьнікаў. Напрыклад, заданні могуць быць наступныя: сфатаграфаваць або нарысаваць экспанат (аб'ект) экскурсіі; вылучыць галоўнае, агульнае і асаблівае ў змесце разгледжаных аб'ектаў; параўнаць вывучаныя з'явы або аб'екты; прымяніць раней атрыманыя веды або міжпрадметныя сувязі для тлумачэння ўбачанага і пачутага на ўроку-экскурсіі.

5. *Заключны этап* для настаўніка ўяўляе сабой работу над удасканаленнем зместу і метадаў правядзення ўрока-экскурсіі па пэўнай тэме. Ён назапашвае вопыт па яго правядзенню, аналізуе ўспрыманне матэрыялу вучнямі на розных этапах экскурсіі, даследуе новы матэрыял.

Аналіз зместу вучэбнай праграмы дазваляе зрабіць выснову аб тым, што вывучэнне гісторыі Беларусі мае шырокія магчымасці для арганізацыі і правядзення ўрокаў-экскурсій у дзяржаўных музеях краіны. Паколькі экспазіцыі большасці абласных, раённых і іншых музеяў маюць комплексны характар, адлюстроўваючы розныя старонкі гісторыі развіцця свайго краю, прывядзём прыклады тэм і спіс дзяржаўных музеяў Мінска, экспазіцыі якіх можна выкарыстоўваць пры планаванні і арганізацыі ўрокаў-экскурсій. *(гл. табліцу 2).*

У залежнасці ад ступені валодання вывучаемым на ўроку-экскурсіі матэрыялам, ведання экспазіцыі пэўнага дзяржаўнага музея, узроўню падрыхтоўкі і ўзросту вучняў экскурсію можа праводзіць як настаўнік, так і экскурсавод дадзенага музея. У першым выпадку настаўніку варта дасканала пазнаёміцца з экспазіцыяй музея, вызначыць патрэб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Табліца 2*

**Дзяржаўныя музеі г. Мінска, у якіх можна правесці вучэбныя экскурсіі**

| Клас | Назва тэмы/раздзела вучэбнай праграмы | Назва музеяў |
|---|---|---|
| VI | Беларускія землі ў старажытныя часы<br>Жыццё насельніцтва беларускіх зямель у Раннім сярэдневякоўі (V—IX стст.)<br>Сярэдневяковыя княствы на тэрыторыі Беларусі ў IX — сярэдзіне XIII ст. | Нацыянальны гістарычны музей, Музей старажытнай беларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, Музей валуноў Інстытута геалогіі НАН Беларусі |
| VII | Беларускія землі ў сярэдзіне XIII—XIV ст.<br>Беларускія землі ў канцы XIV — сярэдзіне XVI ст. | Нацыянальны гістарычны музей, Нацыянальны мастацкі музей, Музей старажытнай беларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, Музей ваеннай гісторыі Рэспублікі Беларусь, Музей гісторыі г. Мінска |
| VIII | Беларусь у другой палове XVI — першай палове XVII ст.<br>Беларусь у другой палове XVII — першай палове XVIII ст.<br>Беларусь у другой палове XVIII ст. | Нацыянальны гістарычны музей, Нацыянальны мастацкі музей, Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і быту, Музей ваеннай гісторыі Рэспублікі Беларусь, Музей гісторыі г. Мінска |
| IX | Беларусь на зыходзе феадалізму: канец XVIII — сярэдзіна XIX ст. | Нацыянальны гістарычны музей, Нацыянальны мастацкі музей, Музей гісторыі беларускай літаратуры, Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і быту, Музей тэатральнай і музычнай культуры, Дом-музей В.Ваньковіча, Музей ваеннай гісторыі Рэспублікі Беларусь, Музей гісторыі г. Мінска |
| IX | Усталяванне капіталізму на беларускіх землях: другая палова XIX — пачатак XX ст. | Нацыянальны гістарычны музей, Нацыянальны мастацкі музей, Музей гісторыі беларускай літаратуры, Музей тэатральнай і музычнай культуры, Дом-музей I з'езда РСДРП, літаратурныя музеі Янкі Купалы, Якуба Коласа, М.Багдановіча, філіял Літаратурнага музея М.Багдановіча «Беларуская хатка» |
| X | Кастрычніцкая рэвалюцыя. Стварэнне беларускай дзяржаўнасці | Нацыянальны гістарычны музей, Музей ваеннай гісторыі Рэспублікі Беларусь |
| X | Беларусь ва ўмовах станаўлення савецкага сацыялістычнага грамадства. Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы | Нацыянальны гістарычны музей, Нацыянальны мастацкі музей, Музей гісторыі беларускай літаратуры, Музей тэатральнай і музычнай культуры, літаратурныя музеі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Музей гісторыі беларускага кіно, Музей гісторыі г. Мінска |
| X | БССР у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў | Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Музей ваеннай гісторыі Рэспублікі Беларусь |
| XI | БССР у другой палове 1940-х — першай палове 1950-х гг.<br>БССР у другой палове 1950-х — 1980-я гг. | Нацыянальны мастацкі музей, Музей гісторыі беларускай літаратуры, Музей тэатральнай і музычнай культуры, літаратурныя музеі Якуба Коласа, П.Броўкі, Музей гісторыі г. Мінска, Музей гісторыі беларускага кіно, Мемарыяльны музей З.І.Азгура |
| XI | Станаўленне і ўмацаванне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь | Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці, Музей сучаснай беларускай скульптуры імя А.Бембеля, Музей сучаснага выяўленчага мастацтва |

**ныя экспанаты і пытанні, якія будуць раскрыты на экскурсіі, прадумаць методыку яе правядзення, а ў выпадку неабходнасці — атрымаць кансультацыю музейнага работніка. Правядзенне ўрока-экскурсіі самім настаўнікам дае такія перавагі, як веданне ім патрабаванняў вучэбнай праграмы, узроўню падрыхтоўкі і індывідуальных асаблівасцей вучняў, магчымасць шырока ўжываць і камбінаваць у яе ходзе экскурсійныя метады і ставіць пазнавальныя задачы школьнікам. Пры планаванні ўрокаў-экскурсій неабходна ўлічваць, што часцей за ўсё іх працягласць перавышае час звычайнага ўрока, таму мэтазгодна іх праводзіць у канцы вучэбнага дня або ў суботу.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Школьная лекцыя** з'яўляецца адной з найбольш цяжкіх для правядзення форм урока. Але многія настаўнікі, наадварот, чамусьці лічаць лекцыю самай лёгкай у метадычным плане формай вучэбных заняткаў — падрыхтуй тэкст і выступай перад класам з працяглым маналогам. Зазначым, што школьная лекцыя істотна адрозніваецца ад свайго аналага ў ВНУ, і перш за ўсё тым, што ў ёй аднолькава значнымі з'яўляюцца навучальныя, развіваючыя і выхаваўчыя мэты занятку. Таму яна складаная і разнастайная па сваёй структуры і выкарыстоўваецца пераважна ў X—XI класах. Сучасны расійскі дыдакт П.І.Підкасісты справядліва адзначае, што пры яе правядзенні настаўнік адначасова выступае і як вучоны, і як педагог, і як прамоўца, і як псіхолаг[9].

Лекцыю ў працэсе выкладання гісторыі ў старшых класах выкарыстоўваюць многія настаўнікі. Гэта ў некаторай ступені выклікана тым, што з дапамогай менавіта такой формы выкладання педагогі імкнуцца ахапіць увесь матэрыял, прадугледжаны праграмай, і даступна яго данесці да вучняў. Не апошнюю ролю ў гэтым адыгрываюць і стэрэатыпы аб ролі настаўніка пры арганізацыі школьнай лекцыі. Многія па-ранейшаму бачаць сваю галоўную задачу ў перадачы гатовай інфармацыі вучням, абгрунтоўваючы гэта вялікім аб'ёмам вучэбнага матэрыялу і невялікай колькасцю гадзін на вывучэнне гісторыі ў школе.

Як паказвае практыка выкладання гісторыі ў агульнаадукацыйных установах, далёка не ўсе настаўнікі прытрымліваюцца патрабаванняў да правядзення школьнай лекцыі, якія распрацаваны ў методыцы. Лекцыя не павінна зводзіцца да зачытвання або дыктоўкі гатовага тэксту. Пасіўнае слуханне вучнямі матэрыялу або яго механічнае запісванне з'яўляюцца надзвычай непрадуктыўнымі дзеяннямі. Эфектыўная лекцыя спалучае ў сябе глыбокі змест вучэбнай тэмы з рацыянальнай формай яго выкладання.

Першым крокам настаўніка да яе падрыхтоўкі з'яўляецца ***вызначэнне яе тыпу***. У залежнасці ад дыдактычных задач вылучаюць лекцыі аглядныя (уводныя або заключныя), тэматычныя і абагульняючыя[10]. Па спосабу выкладання пералічым наступныя тыпы лекцый[11].

У *праблемнай лекцыі* вучэбны матэрыял прадстаўлены тэарэтычнымі канцэпцыямі і мае праблемны характар. Такі тып лекцыі дае настаўніку магчымасць арганізаваць самастойную пазнавальную работу школьнікаў.

На *візуальнай лекцыі* асноўны змест вучэбнага матэрыялу прадстаўлены з дапамогай нагляднавобразных форм — малюнкаў, графікаў, схем, дыяграм і г.д. На ўроку можна выкарыстоўваць і яе варыянт з выкарыстаннем камп'ютара. Як адзначае беларускі дыдакт М.І.Запрудскі, камп'ютарная лекцыя — гэта змястоўна і лагічна звязаная паслядоўнасць аб'ектаў, якія дэманструюцца на маніторы і (або) на экране з дапамогай праектара[12]. Выкарыстанне камп'ютара дазваляе дэманстраваць пэўныя з'явы ў інтэрактыўным рэжыме, выкарыстоўваць відэа- і аўдыёфрагменты.

На *«лекцыі ўдвух»* вядучымі з'яўляюцца два чалавекі — настаўнік і спецыяльна падрыхтаваны вучань, якія ў ходзе лекцыі ўзаемадзейнічаюць на праблемна-арганізацыйным узроўні як паміж сабой, так і з астатнімі вучнямі.

На *лекцыі-кансультацыі* ўдзел прымае спецыяльна запрошаны спецыяліст па вывучаемай праблеме.

У *лекцыі-правакацыі, або лекцыі з запланаванымі памылкамі* фарміруюцца ўменні школьнікаў апэратыўна аналізаваць змест вучэбнага матэрыялу, арыентавацца ў вучэбнай інфармацыі і яе ацэньваць.

На *лекцыі-дыялогу* вучэбны матэрыял падаецца праз серыю пытанняў, на якія вучні павінны адказаць непасрэдна ў ходзе лекцыі.

На *лекцыі з прымяненнем элементаў гульні*, напрыклад, «мазгавога штурму», школьнікам прапануецца тэма, з якой яны фармулююць праблему і самі спрабуюць яе вырашыць.

Настаўнік павінен усведамляць, што школьную лекцыю мэтазгодна праводзіць:

- калі матэрыял па адпаведнай тэме вучэбнай праграмы адсутнічае ў вучэбным дапаможніку або не адпавядае сучаснаму ўзроўню развіцця гістарычнай навукі;
- пры вывучэнні новага матэрыялу, які мала ці зусім не звязаны з папярэднім;
- пры абагульненні розных раздзелаў вывучанага вучэбнага матэрыялу;
- напрыканцы вывучэння буйной тэмы, раздзела;
- пры паведамленні вучням звестак аб практычным прымяненні вывучаных заканамернасцей;
- пры выяўленні складаных заканамернасцей;
- пры вывучэнні матэрыялу праблемнага характару;
- пры вывучэнні тэм, змест якіх асабліва патрабуе ўстанаўлення міжпрадметных сувязей;
- пры навучанні школьнікаў прыёмам разважання, параўнання, аналізу, доказу і г.д.;
- пры вывучэнні вялікага аб'ёму гістарычнага матэрыялу, які не можа быць разгледжаны ў рамках традыцыйнага ўрока.

***Умовамі эфектыўнага правядзення*** лекцыі з'яўляюцца[13]:

- падрыхтоўка апераджальных заданняў для вучняў па тэме лекцыі на папярэднім уроку (паўтарыць раней вывучаны матэрыял, прачытаць пэўны дакумент і г.д.);
- падбор праблемнай, эмацыянальна афарбаванай, у чымсьці нават інтрыгуючай фармуліроўкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тэмы лекцыі, якая выклікча цікавасць да вучэбнага матэрыялу і прыцягне ўвагу школьнікаў. Назву лекцыі можна суправадзіць эпіграфам, які дапаможа актуалізаваць галоўнае пытанне або стаць варыянтам праблемнага задання;

• дакладнае прадумванне і паведамленне вучням плана лекцыі (настаўнік можа і не даваць гатовы план, а ў якасці пазнавальнага задання прапанаваць такую работу вучням);

• пастаноўка пазнавальнага (праблемнага) задання перад вучнямі ў пачатку лекцыі: падчас яе правядзення яны будуць шукаць адказы на яго, а ў канцы — абмяркуюць знойдзеныя рашэнні;

• паступовае і паслядоўнае выкладанне кожнага пункта плана з абагульненнямі і вывадамі пасля кожнага з іх;

• наяўнасць лагічных сувязей пры пераходзе да наступнага пункта плана;

• даступнасць матэрыялу, які неабходна раскрыць у ходзе лекцыі;

• выкарыстанне разнастайных сродкаў навучання, у тым ліку тэхнічных;

• запіс на дошцы новых тэрмінаў, імёнаў, дат, геаграфічных назваў;

• авалоданне вучнямі ўменнямі вылучаць галоўнае, складаць план, канспектаваць, рабіць вывады;

• выкарыстанне ў ходзе лекцыі прыёмаў актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці школьнікаў (стварэнне праблемнай сітуацыі, эўрыстычная гутарка і г.д.);

• правядзенне выніковай гутаркі, практыкума або кароткай праверачнай работы па тэме лекцыі з мэтай высвятлення эфектыўнасці лекцыйнага заняткую і ацэнкі ступені зваротнай сувязі.

Перш чым праводзіць урок-лекцыю, трэба ўпэўніцца, што ўсе вучні умеюць складаць разгорнуты план і канспект параграфа і расказа настаўніка, пазнаёміць іх са скарачэннямі, якія можна ўжываць падчас вядзення запісаў. Прапануем варыянты спалучэння метадычных прыёмаў і сродкаў навучання, якія могуць выкарыстоўвацца ў ходзе лекцыі настаўнікам, са спосабамі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў і відамі пазнавальных заданняў *(гл. табліцу 3)*[14]:

Пры правядзенні лекцыі неабходна прытрымлівацца ***наступных правіл:***

1. Паведамляць матэрыял лекцыі ў адпаведнасці з планам.

2. Больш увагі адвесці тым пытанням, якія слаба раскрыты ў вучэбных дапаможніках.

3. З дапамогай тэмбру голасу, інтанацыі, лагічных выдзяленняў звяртаць увагу вучняў на галоўнае, неабходнае для запамінання, і другаснае, патрэбнае для ілюстрацыі, пазбягаць аднастайнасці і манатоннасці маўлення.

4. Дыктаваць для запісу дакладныя фармуліроўкі асноўных паняццяў тэмы.

5. Пры запісе пад дыктоўку сачыць за тэмпам выкладання, час ад часу кантраляваць тых вучняў, якія запісваюць марудна.

6. Складаныя для ўспрыняцця на слых тэрміны, скарачэнні, прозвішчы запісваць на дошцы.

7. Адчуваць і разумець рэакцыю класа, выкарыстоўваць зваротную сувязь.

8. Абагульняючую выснову па лекцыйным матэрыяле могуць зрабіць не толькі настаўнік, але і вучні ў ходзе паўторна-абагульняючай гутаркі і абмеркавання праблемных пытанняў, якія былі пастаўлены ў пачатку занятку.

*Табліца 3*

**Шляхі арганізацыі актыўнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў у ходзе ўрока-лекцыі**

| Метадычныя прыёмы і сродкі навучання | Спосабы вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў | Варыянты пазнавальных заданняў |
|---|---|---|
| Тлумачэнне настаўніка з выкарыстаннем выяўленчай і (або) умоўна-графічнай нагляднасці | Складанне плана лекцыі, удзел у паўторна-абагульняючай гутарцы | Сфармуліраваць вывады, выканаць тэставыя заданні |
| Праблемнае выкладанне вучэбнага матэрыялу | Канспектаванне, удзел ва эўрыстычнай гутарцы, вырашэнне праблемных задач | Выканаць праблемныя заданні |
| Абагульняючая характарыстыка з выкарыстаннем статыстычнай інфармацыі | Складанне параўнальна-абагульняючай або канкрэтызуючай табліцы, фармуліроўка высноў, складанне плана лекцыі | Выканаць лагічныя заданні, заданні па пераводу тэкставай інфармацыі ў знакава-сімвальную |
| Разважанне на аснове лагічных схем | Складанне разгорнутага плана лекцыі, абагульняючай характарыстыкі | Выканаць лагічныя і праблемныя заданні, тэсты, заданні па пераводу тэкставай інфармацыі ў знакава-сімвальную і наадварот |
| Вобразнае выкладанне з элементамі тлумачэння і абагульняючай характарыстыкі | Складанне разгорнутага плана лекцыі, удзел у абагульняючай гутарцы | Выканаць творчыя заданні |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ













У ходзе ўрока-дыскусіі вучні абмяркоўваюць разнастайныя думкі па той ці іншай праблеме, абараняюць ці абвяргаюць пэўныя тэарэтычныя палажэнні. Пры вывучэнні гісторыі ў сучаснай школе, асабліва ў старшых класах, настаўнік выкарыстоўвае элементы дыскусіі практычна на кожным уроку. Дыскусія заклікана высветліць разнастайныя пункты гледжання яе ўдзельнікаў на пэўную праблему, а пры неабходнасці — усебакова прааналізаваць кожны з іх і садзейнічаць фарміраванню ўласнага погляду кожнага з вучняў на гістарычную праблему. Для ўдзелу ў дыскусіі неабходна грунтоўна вывучыць матэрыял вучэбнага дапаможніка, дадатковую літаратуру, пазнаёміцца з фрагментамі гістарычных крыніц у хрэстаматыі. Гэта неабходна, каб падрыхтаваць адказы на пытанні, якія будуць абмяркоўвацца на ўроку. Пытанні, як правіла, паведамляюцца вучням загадзя.

Роля настаўніка падчас урока-дыскусіі заключаецца ў арганізацыі дыскусіі, кантролі за яго правядзеннем, прадастаўленні школьнікам магчымасці выказацца і зрабіць высновы, пры гэтым не навязваць свайго погляду. Ён сочыць за парадкам у класе, фармулюе праблемы для абмеркавання, задае ўдакладняючыя пытанні, імкнецца актывізаваць пасіўных вучняў і не забывае заслухаць пункт гледжання ўсіх удзельнікаў дыскусіі.

Арганізуючы дыскусію, настаўнік павінен прытрымлівацца ***наступных правіл:***

1. Пазбягаць недакладных і двухсэнсоўных пытанняў.

2. Даваць час на абдумванне адказаў, звяртаць увагу вучняў на кожны адказ, удакладняць выказванні школьнікаў.

3. Задаваць удакладняючыя пытанні, пазбягаць празмерных абагульненняў, вытрымліваць лагічныя паўзы.

4. Тактоўна перапыняць тых вучняў, якія выступаюць зашмат або адхіляюцца ад тэмы.

Пры арганізацыі дыскусіі неабходна дакладна вызначаць яе этапы. ***Уводны этап*** заключаецца ў падрыхтоўцы і далучэнні ўсяго класа да дыскусіі. Фармулюецца праблема або тэма дыскусіі, намячаецца план яе абмеркавання, вылучаюцца асноўныя пункты гледжання, вызначаецца рэгламент, правілы і ўмовы яе правядзення, пры неабходнасці раздаецца патрэбны дыдактычны матэрыял. Вучні знаёмяцца з «Памяткай удзельніку дыскусіі» і «Правіламі вядзення дыскусіі»[15]

**Памятка ўдзельніку дыскусіі**

1. Перад тым, як выступаць, дакладна вызначы сваю пазіцыю.

2. Упэўніся ў тым, што ты правільна разумееш сутнасць праблемы.

3. Уважліва выслухай апанента, толькі потым прадстаўляй свой пункт гледжання.

4. Памятай, што лепшым спосабам доказу або абвяржэння з'яўляюцца бяспрэчныя факты.

5. Не забывай, што лепшым спосабам пераканаць праціўніка з'яўляецца дакладная аргументацыя і логіка.

6. Спрачайся сумленна і шчыра, не скажай думак і слоў сваіх апанентаў.

7. Гавары дакладна, зразумела, проста і сваімі словамі, а не «па паперцы».

8. Не саромейся прызнаць праваты апанента, калі ты аказаўся не правы.

9. Не дапускай зневажальных выказванняў, насмешак, прычэплівання ярлыкоў.

10. Завяршаючы выступленне, падсумуй сказанае табой і зрабі высновы.

**Правілы вядзення дыскусіі**

1. Крытыкуй не апанентаў, а іх ідэі.

2. Мэта дыскусіі не ў вызначэнні пераможцы, а ў дасягненні кансэнсусу.

3. Усе ўдзельнікі дыскусіі павінны прымаць у ёй удзел.

4. Выступленні павінны праходзіць арганізавана, з дазволу вядучага.

5. Кожны ўдзельнік мае права і магчымасць выказаць сваю думку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**6. Абмеркаванню падлягаюць усе без выключэння пазіцыі.**

**7. У працэсе дыскусіі ўдзельнікі могуць змяніць сваю пазіцыю пад уздзеяннем фактаў і аргументаў.**

**8. Неабходна падводзіць прамежкавыя і канчатковыя высновы дыскусіі.**

**Прывядзём прыклады дыскусійных пытанняў, якія можна разгледзець на ўроках гісторыі: «Ці можна лічыць уніяцтва нацыянальнай рэлігіяй беларусаў?», «Хто вінаваты ў развязванні Першай сусветнай вайны? Ці можна было яе пазбегнуць?», «Якія былі альтэрнатывы развіцця палітычных падзей у Расійскай імперыі ў лютым 1917 г.?» і г.д. Менавіта на дадзеным этапе настаўнік пераводзіць праблемнае пытанне, якое з'яўляецца асноўным для дыскусіі, у праблемную сітуацыю.**

**На *асноўным этапе* дыскусіі ў форме канструктыўнага дыялогу вядзецца абмеркаванне праблемнага пытання. Настаўнік кантралюе ход дыскусіі і каменціруе выказванні і меркаванні школьнікаў, коратка пазначае на дошцы асноўныя ідэі і палажэнні, робіць абагульненні, адзначае адрозненні і падабенства пунктаў погляду, ставарае ўмовы для выступлення кожнаму вучню.**

**На *выніковым этапе* коратка робіцца агляд пачутых фактаў і думак, падагульняюцца абмеркаваныя праблемы, робяцца высновы, аналізуецца ход самога абмеркавання, высвятляюцца шляхі прымянення атрыманых вынікаў і перспектывы вывучэння тэмы. На гэтым этапе таксама вызначаюцца найбольш актыўныя ўдзельнікі дыскусіі, выстаўляюцца адзнакі і даецца дамашняе заданне.**

**Дыспут — гэта жывая, гарачая спрэчка, выкліканая жаданнем яго ўдзельнікаў глыбей і падрабязней разабрацца ў пытаннях, якія прапанаваны для абмеркавання. Станоўчыя якасці дыспуту заключаюцца ў тым, што ён дапамагае ўдзельнікам дакладна выказваць свае думкі, прытрымлівацца логікі доказаў, дазваляе аргументаваць сваю пазіцыю, адстойваць свой пункт гледжання, глыбока і ўсебакова аналізаваць і ацэньваць праблемы. Падрыхтоўка да дыспуту пачынаецца з вызначэння і фармулёўкі тэмы, паведамлення пра ўдзельнікаў мерапрыемства, падбору наглядных сродкаў навучання і метадычнай дапамогі ўдзельнікам. На гэтым этапе вялікае значэнне мае правільная фармулёўка тэмы. У ёй абавязкова павінен прысутнічаць спрэчны элемент, магчымасць для сутыкнення розных пунктаў гледжання. Таму сама фармулёўка павінна абуджаць думку вучняў, гучаць востра і праблемна, напрыклад, «Ці была для жыхароў Беларусі вайна 1812 года Айчыннай?», «Сялянская рэформа 1861 года: вызваленне ці абрабаванне сялян?» і г.д.**

**Пасля вызначэння тэмы трэба сфармуляваць пытанні, прычым не трэба прапаноўваць іх вельмі шмат. З гэтымі пытаннямі, як і пры арганізацыі дыскусіі, вучняў знаёмяць загадзя. Тэма і пытанні дыспуту суправаджаюцца спісам рэкамендуемай літаратуры. Яна будзе стымуляваць пазнавальны інтарэс вучняў, забяспечыць дадатковы матэрыял для абмеркавання, дазволіць удзельнікам дыспуту абгрунтаваць свае пазіцыі, назапасіць аргументы і прыклады. Ад настаўніка залежыць, наколькі будзе падтрымлівацца інтарэс да чакаемай размовы і як будзе арганізаваны працэс абдумвання прапанаваных пытанняў; наколькі ў гэты працэс будуць уцягнуты ўсе вучні класа.**

**Перад дыспутам увазе вучняў прапануюцца *правілы* яго вядзення:**

**1. Прадумай галоўнае, што хочаш даказаць.**

**2. Лепшы доказ — дакладныя факты.**

**3. Гавары лагічна і паслядоўна.**

**4. Выказвайся толькі пра тое, у чым добра разабраўся сам.**

**5. Паважай свайго апанента і не скажай яго думкі.**

**6. Не паўтарай тое, што ўжо было сказана да цябе.**

**7. Не размахвай рукамі і не павышай голасу[16].**

**Прапануем пазнаёміцца з «Памяткай удзельніка дыспуту».**

**Памятка ўдзельніка дыспуту**

**1. У спрэчцы ўсе роўныя пры адстойванні свайго пункту гледжання.**

**2. На дыспуце няма назіральнікаў, кожны — актыўны ўдзельнік размовы.**

**3. Пачынаючы спрачацца, дакладна і канкрэтна выкажы палажэнні, якія будзеш абараняць і даказваць.**

**4. Уважліва слухай апанентаў, па ходу іх выступлення рабі нататкі, пазначай усё, што табе здаецца незразумелым.**

**5. Спрачайся сумленна і шчыра, не скажай думак і слоў сваіх апанентаў.**

**6. Даказваючы або абвяргаючы, прапануй аргументы і патрабуй таго ж ад апанентаў.**

**7. Калі даказалі памылковасць твайго меркавання, май мужнасць прызнаць правату супрацьлеглага боку.**

**8. Выпрацоўка пагаднення (кансэнсусу) у вырашэнні праблемы можа адбыцца толькі з дапамогай фактычнага матэрыялу.**

**Накіраванасць дыспуту, яго эфектыўнасць у значнай ступені вызначаюцца ўменнем настаўніка ва ўступным слове дакладна і канкрэтна акрэсліць тэму і праблемнае поле дыспуту, востра і пераканаўча паставіць пытанні перад класам, выклікаць у вучняў жаданне думаць, спрачацца, абмяркоўваць. Таму роля настаўніка ў ходзе дыспуту не павінна зводзіцца толькі да таго, каб прадастаўляць слова ўдзельнікам дыспуту. Ён можа каменціраваць чарговае выступленне, падкрэсліваць яго асноўную думку; праводзіць сутыкненне новага пунк-**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ту гледжання з выказаным раней; прапаноўваць вучням выразіць свае адносіны да пэўнага выказвання; словам, жэстамі або мімікай рэагаваць на спрэчныя сцвярджэнні або выказваць сваю згоду з імі. Але ўсё гэта настаўнік робіць з пазіцыі педагагічнага такту, падтрымлівае і стымулюе пачатую размову, накіроўвае яе ў патрэбнае рэчышча. Вельмі важна, каб у час правядзення дыспуту ў класе павінна быць створана атмасфера ўзаемнай добразычлівасці.

Падчас дыспуту не трэба забараняць рэплікі і пытанні вучняў з месцаў. Яны дапамагаюць ажыўляць дыспут, павышаюць ступень яго эмацыянальнасці. Настаўнік павінен умела рэагаваць на гэтыя выказванні, пераадрасоўваць іх таму вучню, які выступае, або запрашае вучняў падрабязней развіць выказванне або адказаць на пытанне. Таксама не трэба баяцца выказвання памылковых думак па тым ці іншым пытанні. Дыспут якраз і праводзіцца для таго, каб выявіць падобныя меркаванні і супрацьпаставіць ім правільныя.

На ўроках-дыспутах магчыма ажыццявіць мадэляванне і абмеркаванне ***альтэрнатыўных сітуацый*** — выбару варыянтаў гістарычнага развіцця, якія рэальна існавалі ў гісторыі. Напрыклад, у ходзе вывучэння тэмы «Абвастрэнне палітычнай сітуацыі ў Беларусі вясной — летам 1917 г.» можна прапанаваць вучням абмеркаваць альтэрнатывы грамадска-палітычнага развіцця краіны пасля падзей Лютаўскай рэвалюцыі. Пры аналізе такіх сітуацый выкарыстоўваецца наступная памятка[17]:

**Памятка для аналізу альтэрнатыўных сітуацый гістарычнага развіцця**

1. Сфармулюйце сутнасць кожнага з прапанаваных шляхоў (рашэнняў).
2. Выявіце гістарычную абумоўленасць кожнага з прапанаваных шляхоў (варыянтаў рашэння пытання).
3. Вызначыце свае адносіны да іх.
4. Растлумачце перавагі і недахопы выбранага шляху.
5. Пакажыце перавагі і недахопы адхіленага шляху развіцця.
6. Ацаніце зроблены выбар.

Як бы ўсебакова і глыбока не абмяркоўваліся пытанні, настаўнік павінен зрабіць высновы, але гэта не значыць, што на гэтым дыспут можа завяршыцца. Часам у спрэчках узнікаюць новыя актуальныя праблемы, якія могуць стаць прадметам наступнага дыспуту. Заключнае слова не абавязкова будаваць па строга ўстаноўленай форме. Аднак пажадана, каб яно было кароткім, пераканаўчым і змястоўным; утрымлівала правільнае рашэнне пастаўленай праблемы; абапіралася на найбольш удалыя і цікавыя выступленні вучняў; змяшчала ацэнку дзейнасці кожнага з ўдзельнікаў дыспуту; ставіла новыя праблемы па вывучаемай тэме, якія патрабуюць вырашэння.

Такім чынам, разгледжаныя намі формы ўрока маюць істотны патэнцыял для арганізацыі самастойнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў і спрыяюць эфектыўнаму засваенню вучэбнага гістарычнага матэрыялу.

---

[1] Пидкасистый П.И., Портнов М.Л. Искусство преподавания: первая книга учителя. 2-е изд. М., 1999. С. 129.

[2] Кульневич С.В., Лакоценина Т.П. Современный урок. В 3-х ч. Ч 2. Ростов-на-Дону, 2005.

[3] Наумчик В.Н., Паздников М.А., Ступакевич О.В. Педагогический словарь. Мн., 2006. С. 269.

[4] Родин А.Ф., Соколовский Ю.Е. Экскурсионная работа по истории. 2-е изд., перераб. и доп. М., 1974. С. 48.

[5] Там жа. С. 17.

[6] Корзюк А.А. Методическая подготовка учителя истории к проведению уроков-экскурсий: основные этапы // Альманах современной науки и образования. Тамбов, 2009. № 12. В 2 ч. Ч. 2. С. 91—93.

[7] Тур В., Шульман М. Музей как центр изучения истории // Гісторыя: праблемы выкладання. 1998, № 1. С. 90.

[8] Залуцкая В.Л. Вучэбныя экскурсіі: падрыхтоўка і правядзенне: метад. рэк. Мн., 2009. С. 13.

[9] Пидкасистый П.И., Портнов М.Л. Искусство преподавания: первая книга учителя. С. 87.

[10] Студеникин М.Т. Методика преподавания истории в школе: учеб. для студ. высш. учеб. заведений. М., 2003. С. 177; Пидкасистый П.И., Портнов М.Л. Искусство преподавания: первая книга учителя. С. 90.

[11] Справочник администрации школы по организации учебно-воспитательного процесса / авт.-сост. М.И. Мухин, И.А. Фоменко. М., 2002. С. 106.

[12] Запрудский Н.И. Современные школьные технологии: пособие для учителей. 2-е изд. Минск, 2004. С. 70.

[13] Справочник администрации школы по организации учебно-воспитательного процесса / авт.-сост. М.И.Мухин, И.А.Фоменко. С. 107; Стрелова О.Ю., Вяземский Е.Е. Формы учебных занятий по истории // Настольная книга учителя истории: 5—11 классы / авт.-сост. М.Н.Чернова. М., 2006. С. 59—60.

[14] Стрелова О.Ю., Вяземский Е.Е. Формы учебных занятий по истории // Настольная книга учителя истории: 5—11 классы / авт.-сост. М.Н. Чернова. С. 58.

[15] Короткова М.В. Методика проведения игр и дискуссий на уроках истории. М., 2001. С. 19—20.

[16] Студеникин М.Т. Методика преподавания истории в школе: учеб. для студ. высш. учеб. заведений. С. 178—179.

[17] Лазукова Н. «Альтернативные ситуации» на уроках истории // Преподавание истории в школе. 1993, № 1. С. 35.

*Заканчэнне ў наступным нумары.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ